Едзем у Краснадар!

Беларуская зборная будзе ўдзельнічаць у Нацыянальным чэмпіянаце “Маладыя прафесіяналы” (WorldSkills Russia — 2017)

У Міністэрстве адукацыі адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная ўдзелу нашай краіны ў сусветным руху WorldSkills International. На сустрэчы прысутнічалі першы намеснік міністра адукацыі В.А.Богуш, начальнік упраўлення прафесійнай адукацыі галіновага міністэрства А.Д.Лашук, рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі А.Х.Шкляр, карэспандэнты беларускіх СМІ.

В.А.Богуш падкрэсліў, што ў краіне надаецца вялікае значэнне падрыхтоўцы рабочых кадраў, якія валодаюць сучасным узроўнем ведаў і прафесійных навыкаў, могуць кваліфікавана выконваць тыя работы, якія патрэбны сучасным прадпрыемствам. Менавіта таму наша краіна пазітыўна ўспрымае ўдзел нашых навучэнцаў, студэнтаў, маладых рабочых у сусветным руху WorldSkills, што, безумоўна, паўплывае на якасць падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для нацыянальнай эканомікі, стане штуршком у папулярызацыі рабочых прафесій сярод моладзі, забяспечыць сучасны змест прафесійнай падрыхтоўкі кадраў.

В.А.Богуш адзначыў, што ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца пад эгідай WorldSkills на нацыянальным і міжнародным узроўні, падтрымліваюцца нашай дзяржавай, таму што маюць вялікую карысць і фарміруюць у моладзі станоўчы вобраз рабочага чалавека. Як вядома, у Беларусі праведзены ўжо два нацыянальныя чэмпіянаты WorldSkills, а ў 2015 годзе наша краіна ўпершыню прыняла ўдзел у міжнародным чэмпіянаце ў Бразіліі.

Увогуле, прафесійны конкурс WorldSkills — гэта так званыя алімпійскія гульні працоўных рэсурсаў, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі 76 краін.

— Сёння не трэба пераконваць у тым, як важны для ўдасканалення прафесійнай адукацыі ўдзел нашай каманды у сусветных спаборніцтвах WorldSkills, як важна для нас правядзенне нацыянальных чэмпіянатаў, — паведаміў Аркадзь Ханонавіч. — Гэта новы, вельмі эфектыўны механізм, які працуе на павышэнне статусу рабочага чалавека ў маладзёжным асяроддзі, на абнаўленне зместу падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў, на павышэнне іміджу нашай краіны на міжнародным узроўні, у сусветнай адукацыйнай прасторы.

А.Х.Шкляр пазнаёміў удзельнікаў сустрэчы з тымі спаборніцтвамі, якія чакаюць нашу нацыянальную зборную ў найбліжэйшы час. Папярэдне вялася актыўная падрыхтоўка нашай нацыянальнай зборнай да ўдзелу ў чэмпіянаце краін — членаў Еўразійскай прасторы ў фінале V Нацыянальнага чэмпіянату “Маладыя прафесіяналы” (WorldSkills Russia — 2017), які пройдзе з 16 па 19 мая ў Краснадары і на які збіраецца ад’язджаць наша каманда.

У склад каманды ўваходзяць 36 чалавек з ліку навучэнцаў устаноў прафесійнай адукацыі, студэнтаў УВА і маладых рабочых з розных прадпрыемстваў і арганізацый. Удзельнікі спаборніцтва выступяць у 29 прафесійных кампетэнцыях у 6 сферах дзейнасці. Сярод іх — будаўніцтва, прамысловасць, сфера паслуг, творчасць і дызайн, інфармацыйныя тэхналогіі, транспарт. Навінкай у спісе кампетэнцый стала геадэзія, якую будуць прадстаўляць пераможцы нядаўняга Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства, навучэнцы Гомельскага дарожна-будаўнічага каледжа, філіяла РІПА. Іншыя канкурсанты, перш чым стаць удзельнікамі нацыянальнай каманды, праходзілі рэгіянальныя выпрабаванні. Для членаў нашай зборнай на вядучых прадпрыемствах краіны, у саміх навучальных установах была арганізавана стажыроўка для замацавання тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па прафесійных кампетэнцыях. У падрыхтоўцы канкурсантаў былі задзейнічаны лепшыя педагогі і майстры вытворчага навучання. А.Х.Шкляр звярнуў увагу на фарміраванне экспертнай суполкі ў нашай краіне, якая налічвае больш за 30 чалавек з ліку сапраўдных прафесіяналаў міжнароднага ўзроўню. Сярод іх — спецыялісты прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікі сістэмы прафесійнай адукацыі. Па выніках удзелу ў чэмпіянаце WorldSkills Russia будзе сфарміраваны склад нацыянальнай зборнай Беларусі, якая прыме ўдзел у 44 Міжнародным чэмпіянаце WorldSkills. Спаборніцтвы пройдуць у Абу-Дабі (Аб’яднаныя Арабскія Эміраты).

Як заявіў А.Х.Шкляр, уступленне Беларусі ў WorldSkills International, далучэнне да гэтага сусветнага руху зусім не абмяжоўваецца толькі правядзеннем конкурсаў прафесійнага майстэрства. За гэтым стаіць больш глабальная задача — прафесійную падрыхтоўку кадраў у нашай краіне весці з улікам стандартаў WorldSkills, а значыць з улікам міжнародных тэндэнцый. Акрамя масавых прафесій, па якіх сёння рыхтуюць у сістэме прафесійнай адукацыі, вядзецца і апераджальная падрыхтоўка па шэрагу прафесій. З улікам стандартаў WorldSkills унесены карэкціроўкі ў падрыхтоўку токараў, фрэзероўшчыкаў, станочнікаў, наладчыкаў, зваршчыкаў, цырульнікаў, кандытараў, кухараў, будаўнікоў і шэрага іншых. Створаны рэсурсныя цэнтры, дзе сканцэнтравана самае сучаснае абсталяванне, назапашана вучэбна-метадычнае забеспячэнне, сфарміраваны высокапрафесійны педагагічны склад. Усе вядучыя прадпрыемствы і арганізацыі нашай краіны імкнуцца зрабіць уклад у падрыхтоўку кадраў і прадастаўляюць для ўдзельнікаў спаборніцтваў свае вытворчыя пляцоўкі.

Ала КЛЮЙКО.
kliuiko@ng-press.by

Унікальная лабараторыя адкрылася ў БДУІР

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі 12 мая адкрылася адзіная ў Беларусі вучэбная лабараторыя па абароне інфармацыі — сумесны праект з расійскай IT-кампаніяй “СёрчИнформ”, якая займаецца распрацоўкай сродкаў інфармацыйнай бяспекі.

Кафедра абароны інфармацыі БДУІР унікальная. Яна адзіная ў рэспубліцы рыхтуе спецыялістаў, якія не толькі забяспечваюць кантроль тэхнічных сродкаў і механізмаў сістэм абароны інфармацыі, але і правядзенне атэстацыі і сертыфікацыі на адпаведнасць нарматыўным патрабаванням тэхнічнай абароны інфармацыі. Выпускнікам гэтай кафедры прысвойваецца двайная кваліфікацыя: “спецыяліст па абароне інфармацыі” і “інжынер па тэлекамунікацыях”.

Першы прарэктар БДУІР Сяргей Дзік адзначыў, што канцэпцыя навучання ў БДУІР заключаецца ў сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў з вядучымі IT-кампаніямі на базе агульных лабараторый, навуковых цэнтраў. Гэта дазваляе працаваць непасрэдна з заказчыкамі кадраў. Яны прадастаўляюць свае прадукты, рыхтуюць асобныя дысцыпліны, па якіх вядзецца практыка-арыентаваная падрыхтоўка студэнтаў. Выпускнікі з першых дзён работы ў кампаніях адчуваюць сябе запатрабаванымі спецыялістамі, якія здольны справіцца з вырашэннем любой пастаўленай задачы. Лабараторыя па абароне інфармацыі стала 44-й па ліку лабараторыяй у БДУІР. На падыходзе адкрыццё 45-й.

Кампанія “СёрчИнформ” распрацоўвае рашэнні для абароны інфармацыі ў банкаўскай справе, машынабудаванні, нафтагазавай галіне, дзяржкіраванні. Кампанія перадала ўніверсітэту свой праграмны прадукт “Контур інфармацыйнай бяспекі”, а таксама метадычнае забеспячэнне для яго. Гэтае праграмнае забеспячэнне, ужо ўсталяванае ў новай лабараторыі, дазваляе супрацьдзейнічаць уцечцы камерцыйнай тайны і іншай канфідэнцыяльнай інфармацыі праз кантроль інфармацыйных патокаў, даследаванне ўсіх перададзеных даных, апавяшчэнне аб парушэннях палітыкі бяспекі ў арганізацыях, а таксама правядзенне расследаванняў і папярэджання ўцечкі канфідэнцыяльнай інфармацыі.

— Чаму важна акцэнтаваць увагу на важнасці абароны інфармацыі? Штодня робячы сотні анлайн-аперацый, мы не задумваемся аб захаванасці карпаратыўных і персанальных даных. Напрыклад, перадаём даныя ад банкаўскіх карт трэцім асобам, што прыводзіць да страты грошай, — тлумачыць загадчык кафедры абароны інфармацыі прафесар Цімафей Барбоцька.

Адзін з кірункаў лабараторыі — распрацоўка ўнікальных уласных сродкаў абароны інфармацыі.

— Наша прылада маўленчай абароны інфармацыі “Прыбой” забяспечвае абаронены контур у памяшканні, выключаючы магчымасць перахопу інфармацыі з дапамогай тэхнічных сродкаў за межамі памяшкання. Іншая распрацоўка — дэтэктар, які выяўляе ўцечку інфармацыі з камп’ютараў. Яшчэ адна — электрамагнітныя экраны для занальнага экраніравання памяшканняў. Усе прыборы вырабляюцца на базе БДУІР і ўжо размеркаваны па заказчыках, — паведаміў Цімафей Валянцінавіч.

Спецыялізаваная дысцыпліна “Супрацьдзеянне ўцечцы канфідэнцыяльнай інфармацыі”, якая раней не чыталася ў БДУІР, таксама створана на аснове распрацовак “СёрчИнформ”. Гэты прадмет магістранты факультэта тэлекамунікацый пачнуць вывучаць з верасня 2017 года.

Да новага навучальнага года на кафедры абароны інфармацыі БДУІР “СёрчИнформ” адкрые аўтарызаваны цэнтр кампаніі, у якім выкладчыкі і студэнты будуць праходзіць бясплатнае сертыфікаванае навучанне. Спецыялісты цэнтра распрацуюць асобную праграму па навучанні інфармацыйнай бяспецы школьнікаў. Акрамя гэтага, кампанія “СёрчИнформ” мае вопыт правядзення ў Расіі алімпіяды па інфармацыйнай бяспецы сярод студэнтаў і школьнікаў, таму ў найбліжэйшых планах — правядзенне такіх спаборніцтваў у БДУІР.

Марына ПЫРКОВА.
pyrkova@ng-press.by
Фота аўтара.

BIG DATA — 2017: тэхналогіі будучыні абмяркоўвалі ў БДУІР

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі выступіў арганізатарам III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі BIG DATA — 2017, падчас якой прадстаўнікі 16 краін абмяркоўвалі сучасныя метады апрацоўкі і аналізу вялікіх аб’ёмаў даных і лічбавай інфармацыі. Гэтая тэма з кожным годам становіцца ўсё больш актуальнай не толькі ў галіне IT, але і ў бізнесе, медыцыне, адукацыі, навуцы і іншых сферах дзейнасці. Асноўнымі партнёрамі канферэнцыі выступілі кампаніі Парка высокіх тэхналогій.

На ўрачыстым адкрыцці канферэнцыі, якое адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы, прысутнічалі ганаровыя госці: першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый Шадко, Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін, а таксама прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, прэзідэнт кампаніі BEZNext Барыс Зібіцкер. Адкрыў мерапрыемства рэктар БДУІР Міхаіл Батура. “Першая канферэнцыя, якую мы правялі ў 2015 годзе, мела значны поспех і рэзананс сярод арганізацый і кампаній, што займаюцца распрацоўкамі ў галіне тэхналогій big data. У ходзе падрыхтоўкі і арганізацыі канферэнцыі мы знайшлі мноства партнёраў. Гэта дазваляе развіваць узаемавыгаднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва”, — адзначыў рэктар.

Цікавасць да big data ў Беларусі расце, адпаведныя тэхналогіі ўжо выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці буйныя кампаніі і прадпрыемствы краіны. БДУІР сочыць за тэндэнцыямі і рыхтуе кадры па гэтым кірунку. Наладжана супрацоўніцтва з кампаніяй BEZNext (ЗША), якая спецыялізуецца на распрацоўках у галіне big data. Арганізаваны курсы з выкладаннем на англійскай мове для жадаючых асвоіць асноўныя падыходы і тэхналогіі big data.

“Нашы магістранты і аспіранты пішуць дысертацыі ў галіне big data, каб потым увасобіць свае ідэі ў практычных праектах. Акрамя таго, мы заключылі дагавор з акадэміяй кампаніі IBM (ЗША і Канада) на дыстанцыйнае навучанне нашых студэнтаў у гэтай сферы. У найбліжэйшай будучыні я прагназую рост цікавасці да big data ў Беларусі”, — заявіў першы прарэктар БДУІР Сяргей Дзік.

Першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый Шадко адзначыў, што развіццё тэхналогіі big data ў Беларусі замацавана Дзяржаўнай праграмай развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016—2020 гады. Такія тэхналогіі хутка будуць прымяняцца ў галіне аховы здароўя (“Электронны рэцэпт”), потым — у рэальным сектары эканомікі. У сувязі з гэтым намеснік міністра заявіў, што ў дзяржавы ёсць вялікая патрэба ў IT-спецыялістах, якія здольны думаць крэатыўна і аналітычна.

Прэзідэнт кампаніі BEZNext Барыс Зібіцкер больш падрабязна расказаў, як працуюць тэхналогіі big data ў медыцыне: “Першы крок для сістэмы — высветліць, на што хварэе чалавек і як паставіць правільны дыягназ. Другі крок — вызначыць прычыну захворвання. Трэці — прадказаць, як хворы будзе адчуваць сябе ў залежнасці ад выбранага курсу лячэння. Наступны — зрабіць праекцыю, як захворванне будзе ўплываць на чалавека ў будучыні. І апошні крок заснаваны на сістэме аўтаматызацыі. Яна будзе прапаноўваць розныя рэкамендацыі для пацыента, каб ён увесь час быў здаровы”.

У другі дзень канферэнцыі прайшлі афлайн-майстар-класы спецыялістаў амерыканскіх, канадскіх і галандскіх IT-кампаній. Тэмы дакладаў, дыскусій і круглых сталоў тычыліся выкарыстання тэхналогій big data ў маркетынгу, бізнесе, адукацыі, тэлекамунікацыях, вэб-аналітыцы, ахове здароўя.

Двума днямі канферэнцыя не абмежавалася: 10—13 мая прайшлі спецыяльныя майстар-класы ад M.Stroo (Галандыя), дзе вывучаліся прыклады вырашэння праблем пры рабоце з big data.

IT-канферэнцыя BIG DATA — 2017 стала самай маштабнай пляцоўкай у Беларусі і СНД. Для абмену думкамі і вопытам па пытаннях big data, алгарытмаў машыннага навучання, аптымізацыі IT-рашэнняў і бізнес-рашэнняў у Мінску сабраліся прадстаўнікі 16 краін свету, сярод якіх Кітай, Канада, Турцыя, Германія, Італія. BIG DATA — 2017 аб’яднала больш за 300 экспертаў і навукоўцаў у галіне апрацоўкі і аналізу вялікіх аб’ёмаў даных, распрацовак і ўкаранення новых тэхналогій. За дні работы канферэнцыі было прадстаўлена каля 200 дакладаў.

Кацярына ЗАБАРОНАК.